*Тры апошнія месяцы Нацыянальная бібліятэка Беларусі жыла здагадкамі. І вось 26 сакавіка міністр культуры краіны Леанід Гуляка пазнаёміў яе супрацоўнікаў з новым дырэктарам. Кандыдатур было некалькі. І выбар быў няпросты. Кіраўнік дзяржавы, Міністэрства культуры гэты выбар зрабілі. Раман Матульскі, доктар навук, дэкан факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры з 25 сакавіка 2003 года стаў дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.*

# "Генетычны" код дырэктара

Праз два з паловай гады Нацыянальная бібліятэка ўвойдзе ў новы корпус. За час, што застаўся да заканчэння будаўніцтва, мае быць сфармаваная новая грунтоўная матэрыяльная база. Суперзадача сёння - стварыць на базе рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі найлепшую бібліятэку ў Еўроле. А надзённыя задачы - распрацоўка тэхналогіі пераезду ў новы будынак, стварэнне ў гэтай (старой) бібліятэцы новых інфармацыйных рэсурсаў, перавод усіх дакументаў на электронныя носьбіты. Таму, зазначыў Леанід Гуляка, сёння дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі - перадусім пасада, якая вымагае чалавека, здольнага" працаваць на дзяржаўнай службе.

У сваім першым выступленні новы дырэктар сказаў: *"Дарагія калегі! Я амаль усіх вас добра ведаю. Першы запіс у маёй працоўнай кніжцы зроблены ў Нацыянальнай бібліятэцы, і я вяртаюся сюды з задавальненнем..."*

Р.Матульскі згадзіўся адказаць на пытанні карэспандэнта "К".

— **Раман Сцяпанавіч, прызначэнне сталася для вас нечаканасцю?**

- Сама прапанова была нечаканая. Я працаваў над доктарскай дысертацыяй і асноўны вектар дзейнасці бачыў у адукацыі, навуцы. Хаця досвед практычнай працы я, несумненна, маю. Першыя размовы на тэму майго прызначэння адбыліся яшчэ перад новым годам. Прайшло колькі часу, я паспрабаваў узважыць "за", "супраць', тыя, іншыя аргументы і вырашыў: ёсць неабходнасць і ёсць падстава прыняць прапанову і паспрабаваць сябе ў якасці кіраўніка Нацыянальнай бібліятэкі.

— **Міністэрства культуры было зацікаўлена ў тым, каб вы працягвалі працаваць ва Універсітэце культуры...**

- Рэктар Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч адпусціла мяне вельмі неахвотна. І я адыходзіў з цяжкім сэрцам. Амаль усё маё сталае жыццё звязана з універсітэтам культуры. У 1979 годзе я стаў студэнтам тады яшчэ інстытута культуры. Пасля працаваў у Нацыянальнай бібліятэцы, служыў у войску, вучыўся ў аспірантуры. Працаваў ва універсітэце на розных пасадах - зноўткі, пачынаючы з бібліятэкара, і пацiху дайшоў да дэкана. Думаецца, адміністрацыя універсітэта, як кажуць, мела наконт мяне пэўныя разлікі. Я вельмі ўдзячны універсітэту: ён сфармаваў мяне як выкладчыка, як спецыяліста, як навукоўца. Асабліва адчувалася падтрымка ў гэты апошні год, калі ішоў на абарону доктарскай - мне дапамагалі ўсе.

Ну, але ўсё ж Ядвіга Дамінікаўна вырашыла, што стратэгічна для Беларусі больш важная. Нацыянальная бібліятэка, чым адзін з выкладчыкаў ці адзін з дэканаў. Мы знайшлі паразуменне і па-добраму развіталіся.

— **Падаецца, што універсітэт культуры — асноўны "пастаўшчык" кадраў, у тым ліку і для Нацыянальнай бібліятэкі?**

- Сувязі універсітэта культуры і Нацыянальнай бібліятэкі амаль генетычныя.

Так сталася, што сёння спецыялістаў з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй рыхтуе толькі Беларускі універсітэт культуры, ягоны факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Асноўныя параметры падрыхтоўкі спецыялістаў для бібліятэк задаюцца заказчыкам, і асноўны заказчык - гэта Нацыянальная бібліятэка. Зараз стаіць задача стварэння новай бібліятэкі. Зразумела, і колькасныя, і якасныя параметры падрыхтоўкі спецыялістаў будуць змяняцца, для таго каб у Нацыянальную бібліятэку прыйшлі тыя спецыялісты, якія ёй патрэбны.



— **За два з паловай гады ці не састарэюць цяперашнія "новыя тэхналогіі"?**

- Сапраўды, праблема існуе. Але зараз неабходна прыняць стратэгічныя рашэнні, якія вызначаць развіццё Нацыянальнай бібліятакі на наступнае дзесяцігоддзе. І пачынаць укараненне найноўшых тэхналогій менавіта ў гэтай бібліятэцы. Зразумела, з'явяцца нейкія дапаўненні да тш вельмі складаных камп'ютэрных праграм, з якімі мы будзем працаваць.

Праца распачалася даўно. Досвед неабходна выкарыстоўваць і памнажаць, дзеля таго каб у новы будынак перавезці не толькі кніжны фонд, але і электронныя інфармацыйныя рэсурсы. На традыцыйных папяровых тэхналогіях - экстэнсіўным шляхам - далей развівацца немагчыма. Патрабуюцца велізарныя матэрыяльныя і працоўныя рэсурсы, якія не мэтазгодна такім чынам выкарыстоўваць.

— **Пераемнасць пакаленняў...**

- ...добрая традыцыя. У новую бібліятэку прыйдзе шмат новых людзей. Трэба старанна фармаваць калектыў, каб, як кажуць, не расхістаць човен, захаваць баланс пакаленняў, баланс прафесійнага стажу. Зрэшты, бібліятэкарамі становяцца невыпадковыя людзі. Асмелюся параўнаць іх са святарамі, што перадаюць веды, духоўнасць з пакалення ў пакаленне.

**Дзяніс ГОЛІН**

**Фота Генадзя ЖЫНКОВА**